***В. С. Курылёнак*** *(Мінск),*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры*

# МУЗЕЙ І ШКОЛА: ВОПЫТ РЭАЛЬНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

У 70—80-х гадах XX стагоддзя пачынаюцца радыкальныя змены ў дзейнасці музеяў ва ўсім свеце (у тым ліку і ў нашай краіне): фарміруецца новая асветніцкая канцэпцыя музея, змяняецца сутнасць адносін да наведвальніка, які пачынае ўспрымацца як субяседнік, партнёр; востра адчуваецца патрэба ў з'яўленні асобага тыпу музейнага спецыяліста — "эксперта па наведвальніках", што нарэшце прыводзіць да інтэграцыі музеязнаўства з іншымі навуковымі дысцыплінамі (педагогікай і псіхалогіяй) і з'яўлення новай навуковай дысцыпліны — музейнай педагогікі[1], якая на сённяшні дзень ужо становіцца неад'емнай часткай адукацыйна-выхаваўчага працэсу. Педагогі пераконваюцца, што без прыцягнення наглядных, прадметнах, вобразных метадаў навучання адукацыйны працэс страчвае, магчыма, самае галоўнае — перастае ўздзейнічаць на эмацыянальную сферу дзіцяці. У выніку, яно не засвойвае тую інфармацыю, якая яму прапануецца.

Сярод большасці музейных спецыялістаў таксама ўсталявалася думка аб неабходнасці не толькі асобых форм і метадаў работы з дзіцячай аўдыторыяй, але і спецыялізаваных музейна-адукацыйных праграм. У якасці прыклада такіх варта разгледзець расійскі вопыт, назапашаны больш чым за два дзесяцігоддзі.

Кожная з музейна-адукацыйных праграм абавязкова павінна мець свае задачы. Найбольш важныя з іх наступныя:

— аб'яднанне і ўзмацненне педагагічных магчымасцей музея і школы на аснове іх спецыфікі. Сёння такія праграмы, што адраджаюць экскурсійны метад, асабліва актуальныя. Дзеці зараз катастрафічна страчваюць магчымасць бачыць, разумець убачанае, акцэнтаваць увагу на значныя дэталі, абагульняць. Музейныя ж праграмы — адзін са спосабаў процідзеяння гэтай негатыўнай тэндэнцыі. Яны дазваляюць "вывесці" навучэнца за межы школы, дапоўніць школьнае выкладанне размовамі сярод жывой прыроды, інтэр'ераў музейных залаў, на вуліцах горада;

— стварэнне ў школьніка ўяўлення пра акаляючы свет як пра вялізны Музей чалавечых цывілізацый. Культура вакол нас — гэта вынік дасягнення народаў усяго свету. Кожная рэалія данага свету (рэч, міф, легенда, архітэктурнае збудаванне, музычны твор і г. д.) — вынік гістарычнага развіцця чалавека, адлюстраванне пэўнага этапу культуры і этнічных асаблівасцей. Без усведамлення гісторыка-культурнага значэння рэчаў, з'яў і фактаў культуры немагчыма пазнанне акаляючага свету;

— фарміраванне ў дзяцей навыкаў успрымання музея і патрэбы зносін з ім. І наша асноўная задача заключаецца ў тым, каб стварыць такія ўмовы, пры якіх дзецям у музеі было б утульна, камфортна. А для гэтага школьніку неабходна навучыцца арыентавацца ў складаным музейным асяроддзі, разумець скрыты сэнс акаляючых яго рэчаў[2].

Самыя разнастайныя спосабы вырашэння пералічаных задач садзейнічаюць актыўнаму ўключэнню музейна-адукацыйных праграм у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сістэму базавай і дадатковай адукацыі маскоўскіх школ. Так, музейна-экскурсійная праграма "Прадметны свет культуры", разлічаная на навучэнцаў 1—3 класаў, абагачае методыку школьнага выкладання пры дапамозе прадметных урокаў і экскурсій. Праграма стваралася і дзеля таго, каб пераадолець стэрэатып успрымання музея як нагляднай ілюстрацыі да таго ці іншага прадмета і паказаць, што ў яго ёсць свой шлях, свая адукацыйная задача, якая заключаецца ў фарміраванні каштоўнасных, эмацыянальна афарбаванных адносін да культурнай спадчыны. Гэта асабліва важна для малодшых школьнікаў. Бо калі яшчэ ў дзяцінстве чалавек не далучыўся да прадметнага свету, не пагрузіўся ў стыхію нацыянальнай культуры, яго развіццё будзе няпоўным.

Па кожнай з 20-ці тэм праграм, аб'яднаных у тэматычныя блокі "Прырода", "Горад", "Дом", "Прадмет рукатворны", дзецям прапаноўваліся музейна-экскурсійныя вандроўкі, якія складаліся з трох частак. Кожная вандроўка пачыналася з падрыхтоўкі на ўроку ў школе. Пасля гэтага музейны педагог праводзіў экскурсію ў музеі. Заканчвалася вандроўка ўрокам замацавання, які таксама праводзіў настаўнік у школе. Так станавіліся партнёрамі музейны педагог і настаўнік пачатковых класаў. Дарэчы, для апошняга былі спецыяльна распрацаваны "Матэрыялы для настаўніка", дзякуючы якім ён мог без асаблівых намаганняў пачаць засвойваць методыку нагляднага навучання. Акрамя гэтых матэрыялаў ў праграму былі ўключаны "Творчыя заданні для навучэнцаў".

Другі прыклад супрацоўніцтва музея і школы дае праграма расійскага навукова-практычнага цэнтра па праблемах музейнай педагогікі Дзяржаўнага Рускага музея "Прывітанне, музей!", мэта якой — аб'яднаць намаганні музейнага педагога, работніка дашкольнай установы, школьнага настаўніка для выхавання эстэтычна развітага чалавека праз далучэнне дзяцей да выяўленчага мастацтва і развіццё іх візуальнай адукаванасці. Праграма мае шматузроўневы характар і падзяляецца на некалькі раздзелаў, прысвечаных розным узроставым групам.

Згодна з ідэяй, заняткі па праграме — у дзіцячым садку, школе ці ў музеі — пад куратарствам і пры ўдзеле музейнага педагога праводзяць выхавацелі і настаўнікі. Для супрацоўнікаў дашкольных устаноў і настаўнікаў пачатковай школы былі арганізаваны пастаянна дзеючыя музейна-педагагічныя курсы, выпускнікі якіх атрымлівалі неабходныя метадычныя матэрыялы і слайды.

Альтэрнатыўнай вышэй названым стала маскоўская праграма "Музей і культура". Яна цалкам ажыццяўляецца музейным спецыялістам, які можа правесці "музейныя заняткі" на ўзроўні, амаль недаступным школьнаму настаўніку: граматна пабудаваць курс, вызначыць музеі для наведвання, кваліфікавана правесці ўрокі падрыхтоўкі, замацавання і нават экскурсію. Музейны педагог імкнецца таксама практычна ўзбагаціць кожны ўрок прадметамі "музейнага значэння", якія можна ўзяць у рукі, як трэба разгледзець, даследаваць[3].

У Беларусі развіццё музейна-педагагічнай дзейнасці пачалося ў 90-х гадах XX стагоддзя, пазней чым у Расіі, але на сённяшні дзень ужо можна казаць аб пэўных дасягненнях.

Першыя крокі ў гэтым накірунку ў свой час зрабіў Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе". Тут у 1990 годзе ўпершыню на Беларусі быў створаны сектар, пазней аддзел музейнай педагогікі. Плёнам яго працы была распрацоўка і рэалізацыя цыкла музейна-педагагічных заняткаў, якія аформіліся ў спецы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яльную праграму падтрымкі школьнага курса “Мая Радзіма — Беларусь”. Менавіта яе хацелася б падрабязна разгледзець, бо гэта — “піянер” сярод беларускіх музейна-педагагічных праграм і, дарэчы, з ёю мне давялося працаваць у якасці музейнага педагога.

Мэты праграмы:

Стварыць рэальную аснову для супрацоўніцтва школьнага настаўніка і музейнага педагога.

Узбагаціць наглядным матэрыялам школьны курс для 4-га класа “Мая Радзіма — Беларусь”.

Дапамагчы настаўніку пачатковай школы зрабіць змест вучэбнай праграмы больш багатым і разнастайным за кошт выкарыстання патэнцыялу гісторыка-краязнаўчага музея[4].

Праграма складаецца з некалькіх тэматычных блокаў. Першым блокам з’яўляецца цыкл заняткаў “Знаёмства з музеем”, які бачыцца мастком паміж паўсядзённым асяроддзем дзяцей — вуліцай, пад’ездамі, школай — і спецыяльна арганізаванай прасторай — музеем. У яго ўваходзяць наступныя музейныя заняткі: “Прывітанне, музей!”, “Заглянем у музейныя фонды“, “Музейная бальніца”.

Наступны этнаграфічны блок “Звычаі і побыт нашых продкаў” найбольш поўна раскрывае прадметны свет культуры. Заняткі цыкла фарміруюць у дзяцей уяўленне аб тым, што ў кожны прадмет укладзена праца чалавека, а значыць, прадметны свет — асаблівае яго адлюстраванне, насычанае фантазіяй, уяўленнем аб прыгажосці і нават часткай чалавечай душы. І кожная рэч мае сваю ўласную гісторыю. У блок уваходзяць заняткі :”Ад блакітных кветак — да кашулі дзетак ”,”Ішла каляда калядуючы”,”Круціся ганчарнае кола”,”Вясна — красна на ўвесь свет” і інш.

Блок “Як людзі жылі раней” — гістарычны. Выхаванне пачуцця гісторыі немагчыма без выхавання пачуцця прыгажосці — гэта галоўная задача, якая вырашаецца падчас правядзення заняткаў блока. Кожны з іх — крок на шляху засваення чалавекам мінулага роднай краіны, прычым такое засваенне павінна быць перш за ўсё самастойнай творчасцю. Толькі ў такім выпадку яно будзе эфектыўным. Гэтай думкі прытрымліваецца і вядомы псіхолаг В. Франкл: ”Каштоўнасцям мы не можам навучыцца, каштоўнасці мы павінны перажыць”[5].

Заняткі гэтага блока ўяўляюць сабою “вандроўкі-пагружэнні” ў розныя гістарычныя эпохі, найбольш яскравыя для гісторыі краю. Напрыклад, ва ўмовах Заслаўя — гэта заняткі: ”Як людзі жылі раней”, ”Наш старажытны горад”, ”Знатны род Глябовічаў”, ”У госці да Мехедка-Савіцкіх” і, нарэшце, занятак “Легенды Полацкай зямлі”(своеасаблівы мой дэбют у якасці музейнага педагога).

Амаль кожны занятак суправаджаецца творчымі заданнямі для вучняў, якія насычаны і гульнёвымі прыёмамі, і сур’ёзнымі элементамі. Выкарыстоўваецца таксама музычнае аздабленне некаторых заняткаў, што пажадана б было рабіць значна часцей. Тэматычныя блокі з цягам часу пашыраюцца, праграма не лічыцца завершанай, тым больш што рэсурсы ў запаведніка дастаткова багатыя: не выкарыстаны, напрыклад, яшчэ ў поўнай меры дзеючыя этнаграфічныя комплексы “Млын”, ”Кузня”; зусім не распрацаваны такі накірунак, як “асяродкавае выхаванне”. Ён прадугледжвае зусім новы падыход: “...цэласныя адносіны да прасторы і часу, а таксама некаторую інтуітыўнасць выяўлення самых розных каштоўнасцей існуючага асяроддзя. Гэта вельмі важна, асабліва ў сённяшнім грамадстве, бо спрыяе прымірэнню сучаснага чалавека з прасторавай разнастайнасцю, якая вельмі часта ды-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сануе з багатай гісторыяй, культурнымі здабыткамі, непаўторнымі помнікамі Беларусі...”[6].

Безумоўна, супрацоўнікі гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Заслаўе” творча працуюць у накірунку паляпшэння музейна-педагагічнай дзейнасці, і гэта дае падставу меркаваць, што праз пэўны час існуючая праграма ўзбагаціцца як новымі заняткамі, так і новымі тэматычнымі блокамі.

---

[1] *Медведева Е. Б., Юхневич М. Ю.* Музейная педагогика как новая научная дисциплина // Культурно-образовательная деятельность музеев: Сб. трудов. М., 1997. С. 8.

[2] *Чумалова Т. В.* Роль музейных программ в культурно-образовательном процессе московских школ // Музей. Образование. Культура. Процессы интеграции: Сб. трудов. М., 1999. Вып. 2. С. 52.

[3] *Юхневич М. Ю.* Музейно-образовательные проекты для школы: отечественный и зарубежный опыт // Музей. Образование. Культура. Процессы интеграции: Сб. трудов. М., 1999. Вып. 2. С. 32—34.

[4] *Міронычык В. У., Залуцкая В. Л.* Музейна-педагагічная праграма для пачатковай школы “Мая Радзіма — Беларусь” // Музейная педагогіка. Праблемы арганізацыі работы з дзецьмі. Музейныя сшыткі: Навукова-метадычны зборнік. Мн., 1997. С. 15.

[5] *Франкл В.* Человек в поисках смысла. М., 1990. С. 47.

[6] *Міронычык В. У.* Комплексная навуковая праграма музейна-педагагічнай дзейнасці гісторыка-культурнага запаведніка “Заслаўе”. Заслаўе, 1998. С. 17. (Архіў ГКЗ "Заслаўе".)

***А. Р. Мацевасян*** *(Мінск),*
*метадыст вучэбнага аддзела БелДІПК*

# АДУКАЦЫЙНАЯ ПАЛІТЫКА І ВЫХАВАННЕ ПАТРЫЯТЫЗМУ СРОДКАМІ ВАЕННА-ГІСТАРЫЧНЫХ МУЗЕЯЎ

Нацыянальную адукацыю і выхаванне можна вызначыць як гістарычна ўсталяваную сацыяльна-культурную тэхналогію, на аснове якой новыя пакаленні ўключаюцца ў “трансліруемы культурай сацыяльны вопыт, засвойваюць яго і пераўтвараюць родавы змест канкрэтнай культуры ў асабовыя сімвалы і знакі, што забяспечвае працэс развіцця нацыянальнай культуры і этнасу ў цэлым”[1].

У самым агульным выглядзе мэта нацыянальнай адукацыі і выхавання вызначаецца як узнаўленне і развіццё нацыянальнага тыпу асобы са светапоглядам, які адпавядае сучасным сацыяльным патрабаванням: выхаванне грамадзяніна сваёй краіны і свету з характарыстыкамі нацыянальнага менталітэту. Сутнасцю нацыянальнай адукацыі і выхавання з’яўляецца перадача маладому пакаленню сацыяльна-цэнаснага вопыту этнасу з мэтай фарміравання яго нацыянальнай ментальнасці, выхаванне на гэтай аснове асабовых рыс грамадзяніна сваёй краіны.

Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у сферы адукацыі і выхавання грунтуецца на пэўных прынцыпах. Адзін з іх — “прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей, выхаванне жыхароў рэспублікі дасведчанымі ў сусветнай гісторыі, паваж-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ